**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**
**VIII клас**
**2020/2021 навучальны год**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

## Навошта ў хаце парог?

1) Парог месца ў хаце незвычайнае. 2) З ім звязана мноства народных звычаяў, прыкмет. 3) Нашы продкі лічылі, што парог своеасаблівая мяжа. 4) Яна аддзяляе чалавечае жыллё ад прасторы неасвоенай, нежылой, варожай для чалавека.

5) Парог лічыўся ў народзе месцам, дзе жывуць душы продкаў, якія могуць уплываць на людзей, іх здароўе, заможнасць, узаемаадносіны. 6) З гэтым вераваннем звязаны розныя старадаўнія звычаі. 7) Найбольш вядомы з іх – рытуальнае сядзенне перад парогам напярэдадні **паздкі**, падарожжа. 8) Змест, сімволіка гэтага звычаю звяртанне ў думках да душ продкаў **з просьбай** аб дапамозе ў дарозе. 9) Вось чаму абавязковым элементам гэтага звычаю з'яўляецца маўчанне. 10) Яно абазначае сімвалічнае далучэнне да свету продкаў-нябожчыкаў. 11) Менавіта ў гэтыя кароткія імгненні ўнутранай засяроджанасці і звяртання да памяці продкаў наладжвалася духоўная сувязь жывых людзей з продкамі – добрымі абаронцамі, дарадчыкамі.

*(Паводле У.Коваля)*

1. Зрабіце гукавы запіс выдзеленых у тэксце слоў:

з ім –
паездкі –
з просьбай –

2. Да падкрэсленага ў пятым сказе слова падбярыце сінонім:

Заможнасць - ________________________________________________

3. Знайдзіце ў тэксце сказы, у якіх прапушчаны знакі прыпынку. Запішыце гэтыя сказы, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. На якое правіла зроблены памылкі?

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

__________________________________________________________________

4. Запішыце падкрэслены ў адзінаццатым сказе дзеяслоў і ўтварыце ад яго інфінітыў. Зрабіце марфемны разбор інфінітыва.

______________________________________________________________________

__________________________________________________________________

5. Зрабіце пісьмовы сінтаксічны разбор дзявятага сказа тэксту:

______________________________________________________________________

___________________________________________________________________

6. У беларускай мове ёсць фразеалагізм са словам “парог” у множным ліку. З якім дзеясловам ён ужываецца і якое значэнне мае? Запішыце фразеалагізм і яго значэнне?

______________________________________________________________________

_____________________________________________________________________

___________________________________________________________________

7. Зрабіце словаўтваральны разбор падкрэсленага ў дзясятым сказе слова:
Далучэнне - __________________________________________________________
_________________________________________________________________.

8. Знайдзіце ў тэксце словы, якія з’яўляюцца адпаведнікамі наступных рускіх слоў.
накануне ____________________________________________________________
сосредоточенность_____________________________________________________
воздействовать_______________________________________________________

9. Загаловак тэксту – пытанне. Дайце адказ на яго адным развітым сказам, выкарыстаўшы тэкст.

10. Гэты назоўнік сустракаецца ў тэксце шэсць разоў. Вызначце яго і запішыце два літаратурныя творы з такой назвай. Укажыце іх аўтараў.